Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»
Факультэт турызму і сэрвісу
Навучальны сектар этнічнага турызму
Кафедра беларускай культуры і рэгіянальнага турызму

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫ ТУРЫЗМ У ТРАНСГРАНІЧНЫМ ПАМЕЖЖЫ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ І СУВАЛКАЎСКІМ СУБРЭГІЁНЕ

*Зборнік навуковых артыкулаў*

Гродна
ЮрСаПрынт
2013

УДК 908

**ТАЦЦЯНА ХВАГІНА**

# ПАЛЕСКІЯ МЯСТЭЧКІ Ў ЭТНІЧНЫМ ТУРЫЗМЕ БЕЛАРУСІ

В статье характеризуются основные направления, объекты и формы реализации этнического туризма в Беларуси, одним из которых является создание туров и экскурсий на основе этнографического и исторического наследия бывших местечек. Культурно-исторический феномен полесских местечек рассмотрен с позиций моделирования турпродукта и их интеграции в туристические маршруты.

Этнічны турызм у Беларусі з’яўляецца дастаткова новым і разам з тым вельмі цікавым і перспектыўным накірункам турыстычнай дзейнасці. Ён прадстаўлены разнастайнымі экскурсіямі і турамі, якія прысвечаны народным традыцыям, культуры і побыту беларусаў і іншых этнасаў, што калісьці насялялі альбо зараз насяляюць тэрыторыю краіны. Іх тэматыка ахоплівае розныя бакі народнага жыцця: традыцыйныя заняткі і рамёствы, абрады, народныя гульні і святы, вераванні, фальклор, народны строй, народную кухню, народную медыцыну, народнае дойлідства і г.д.

Беларусь у адпаведнасці з гістарычнымі ўмовамі назапасіла вялікі этнаграфічны скарб. Тут у гарадах, вёсках і мястэчках побач з карэнным насельніцтвам жылі прадстаўнікі іншых народаў і этнічных групаў: габрэі, татары, палякі, рускія (стараверы) і г.д. Кожная этнічная група вызначалася сваёй адметнасцю, але не была адасоблена ад іншых: яна і ўплывала, і адначасова сама знаходзілася пад уплывам сваіх суседзяў. Дзякуючы гэтаму этнаграфічная спадчына Беларусі вельмі цікавая і разнастайная.

Другая палова XX ст. у Беларусі, калі актыўна разгарнуўся працэс нівеліравання розных этнасаў дзеля пераўтварэння іх у адзіны рускамоўны “савецкі народ”, была неспрыяльнай для развіцця этнічнага турызма. Паказ народнага жыцця і культуры абмяжоўваўся сціплымі этнаграфічнымі экспазіцыямі краязнаўчых музеяў, дзе галоўны акцэнт рабіўся на параўнанні мінулага з сучаснасцю на карысць савецкаму ладу жыцця. Попыт на экскурсіі і падарожжы этнаграфічнага зместу пачаў пашырацца ў 1990 – 2000-я гг. Ён даў штуршок стварэнню новых, цікавых экспазіцый, музеяў і этнаграфічных вёсак, такіх як, Музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій “Дудуткі”, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах, этнаграфічны комплекс “Беларуская вёска XIX ст.” пад Магілевам.

Разам з тым падыход да этнаграфічнай тэмы стаў іншым. Традыцыйны паказ экскурсантам прадметаў ці этнаграфічных аб’ектаў змяніўся на цікавыя канцэртна-абрадавыя і анімацыйныя праграмы, удзельнікі якіх могуць не толькі пабачыць турыстычныя аб’екты, але пазнаёміцца значна бліжэй з народным жыццём: прыняць удзел у тым ці іншым вытворчым працэсе (сесці за ткацкі станок, паспрабаваць самастойна зрабіць гліняны гаршчок ці прымерыцца да кавальскай справы). Вялікую папулярнасць у этнічным турызме Беларусі зараз набылі

дэгустацыі страў і напояў народнай кухні, удзел у народных гульнях, забавах і абрадах, такіх, як гуканне вясны, калядаванне, шчадраванне, купальскі абрад. Аздобай этнатураў з'яўляецца катанне турыстаў на традыцыйных траспартных сродках: вясковых калёсах, напоўненых духмяным сенам і упрыгожаных посцілкамі, фурманках, санях ці лодках.

Пашырэнне этнаграфічнай тэматыкі звязана і з так званымі настальгічнымі турамі, удзельнікі якіх падчас свайго візіту жадаюць пазнаёміцца не толькі з сучаснай краінай, але і зазірнуць у яе мінулае, у тыя гарады, мястэчкі і вёскі, дзе раней жылі яны самі ці іх продкі. Каб адпавядаць гэтым запросам, трэба добра знаць свой край. Цудоўным дапаможнікам у этнаграфічным вывучэнні Заходняга Палесся з'яўляецца турыстычны даведнік М. Марчака "Przewodnik po Polesiu", выдадзены ў 1935 г. намаганнямі Брэсцкага аддзялення Польскага таварыства краязнаўчага (РТК).

Міжваенны час, калі заходняя частка Палесся знаходзілася ў складзе польскай дзяржавы, быў не толькі перыядам зараджэння на Палессі турыстычнай справы. Вельмі важна, што турысты, якія ў той час наведвалі Палессе, траплялі сюды не транзітам, а ехалі мэтанакіравана, каб пабачыць на ўласныя вочы гэты таямнічы і чароўны край, апеты ў творах Марыі Радзевічуўны і іншых творцаў, закаханых у Палессе [1, с. 119]. Гасцей цікавілі палескія багны, рака Прыпяць з яе шматлікімі прытокамі, палескія абарыгены – палешукі і іх быт, а таксама гарады, архаічныя вёскі і каларытныя палескія мястэчкі.

Характэрнай рысай гэтых мястэчак быў не толькі іх невялікі памер, а перш за ўсё арыгінальнае спалучэнне рысаў гарадскога і вясковага ладу жыцця і стракаты этнічны і канфесійны склад насельніцтва. У мястэчках частка жыхароў займалася рамяством і гандлем, частка – сельскай гаспадаркай. Прадстаўнікі розных этнічных груп займалі сваю нішу ў сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці мястэчка, але веравызнанне, традыцыі, мова, прафесійны занятак не раз'ядноўвалі жыхароў мястэчка, а спрыялі добрасуседству, талерантнасці, утварэнню непаўторнай местачковай атмасферы. Цэнтрам грамадскага жыцця і своеасаблівым сімвалам мястэчка заўсёды была гандлёвая плошча, на якой стаялі раней уніяцкая, потым праваслаўная царква і касцёл, а паблізу знаходзілася сінагога ці малітоўны дом.

У канцы XIX – XX ст. лёс беларускіх, у тым ліку палескіх мястэчак склаўся па-рознаму. Некаторыя сталі чыгуначнымі станцыямі, пачалі хутка расці і ў рэшце рэшт ператварыліся ў гарады, іншыя – саступілі сваю ролю і сталі вялікімі вёскамі. Значна змяніўся выгляд былых мястэчак: шмат местачковай забудовы было зруйнавана падчас сусветных войнаў, а таксама ў савецкі час, калі зачыняліся і руйнаваліся сакральныя будынкі, зносіліся старыя могілкі. У выніку Другой сусветнай вайны ў былых мястэчках змяніўся нацыянальны і канфесіянальны склад жыхароў, тут зніклі цэлыя пласты культуры, перш за ўсё габрэйскай.

Нягледзячы на гэта, палескія мястэчкі ў той ці іншай ступені яшчэ захавалі свае непаўторныя рысы – гістарычную планіроўку і забудову, якая можа выступаць цудоўным фонам для славеснай рэканструкцыі рэалій былога местачковага жыцця. Дзякуючы настальгічным турам і цікавасці маладога пакалення да

сваіх каранёў у палескіх мястэчкаў ёсць перспектыва стаць цікавымі аб'ектамі турыстычнага інтарэсу.

У апошні час досыць вялікую папулярнасць у палескім рэгіёне набыў Моталь – былое мястэчка, а зараз – вёска Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Моталь знаходзіцца на старажытным гандлёвым шляху, які ішоў уздоўж ракі Ясельды з Пінска ў бок Пружанаў. Першыя згадкі пра Моталь датаваны 1422 г., а ў 1555 г. Моталь атрымаў магдэбурскае права [2, с. 7-8]. Згодна з паданнем, каралева Бона, да якой перайшло былое Пінскае княства, апынуўшыся ў Моталі, звярнула ўвагу на тое, што маталянкі ўсе як адна былі ў скураных чаравічках, а не ў лапцях, і таму загадала надаць Моталю правы мястэчка. Вядома, што каралева Бона Сфорца пасяліла тут майстроў з Італіі, якія з часам пародніліся с карэннымі маталянамі-палешукамі. Іх нашчадкі носяць прозвішчы – Палто, Шыкалай, Базан, Марзан, Кузюр.

У мінулым (XVI – першай палове XX ст. ст.) у Моталі пражывала шмат габрэяў. Тут – радзіма першага прэзідэнта Ізраіля Хаіма Вейцмана (1874 – 1952) [3, с. 579]. Дом Вейцманаў захаваўся, але перанесены на іншае месца, на бераг Мотальскага возера. Падчас фестываляў, якія праходзяць у Моталі, тут прымаюць гасцей і дэманструюць невялічкую экспазіцыю, прысвечаную габрэйскаму жыццю. Моталь, дзякуючы таленавітым, энэргічным і прадпрамальным жыхарам, заўсёды вылучаўся сярод навакольных вёсак і іншых мястэчак. "За польскім часам", як кажуць на Палессі пра міжваенны перыяд XX ст., тут наладзілі выраб каўбас і вяндлін. Зараз гэтая справа, якой раней вучыліся ў Варшаве і Кракаве, адноўлена і спрыяе папулярнасці Моталя.

У 1990-я гады адчыніў дзверы Мотальскі музей народнай творчасці – адзін з лепшых этнаграфічных музеяў Беларусі. Яго асаблівасць – гэта афармленне музейных залаў павялічанымі старымі фотаздымкамі, якія зрабіў у першай палове і сярэдзіне XX ст. мясцовы фоталетапісец А.А. Мінюк [3, с. 551]. Разам са звычайнай экскурсіяй па экспазіцыі мотальскі музей прапануе некалькі вельмі цікавых анімацыйных праграм: "Бабулін куфэрак", "Жывы гук", "Вясельны каравай", якія дапаўняе дэгустацыя мясцовых мясных вырабаў і іншых страў. Штогод у сярэдзіне жніўня адбываецца фестываль "Мотальскія прысмакі", які суправаджаецца вялікім кірмашом, шматлікімі дэгустацыямі і майстар-класамі народнай кухні, спаборніцтвам паміж мясцовымі гаспадынямі, а таксама цудоўнымі спевамі і танцамі творчых народных калектываў. Усё гэта дазволіла ўключыць Моталь у шэраг цікавых маршрутаў, адрасаваных розным катэгорыям турыстаў: "Узоры і песні Палесся", "Палескі вянок" (экскурсіі для беларускіх турыстаў), "Чары Палесся" (польскі настальгічны тур), "На радзіму Хаіма Вейцмана" (тур "Габрэі на Палессі").

На шляху ўздоўж Ясельды знаходзіцца яшчэ адно былое мястэчка – Бездзеж. Яно згадваецца ў 1499 г., і ў 1561 – 1566 гг. [4, с. 511] Бездзеж атрымаў правы мястэчка. У верасні 1771 г. ля Бездзежа гетман М.К. Агінскі атрымаў сваю адзіную перамогу над атрадам расійскага палкоўніка Альбічава, накіраваным на падаўленне барскіх канфедэратаў. На месцы бою зараз можна пабачыць занядбаную каплічку, пастаўленую ў гонар Канстытуцыі Рэчы Паспалітай, прынятай 3 мая 1791 г.

[1, с. 169]. У цэнтры Бездзежа знаходяцца драўляная Свята-Троіцкая царква (1784 г.) і Троіцкі касцёл (1820 г.). Забудова Бездзежа большай часткай драўляная, побач з дамамі – прыгожыя садкі і вялікія кветнікі. Нельга не звярнуць увагу на жыхарак Бездзежа, якія вылучаюцца стаццю, шляхетнасцю, добрым густам, майстэрствам і адданасцю справе захавання традыцый народнай вышыўкі.

З 1999 г. тут працуе ўнікальны этнаграфічны музей "Бездзежскі фартушок", калекцыя якога налічвае больш за 130 фартушкоў, сабраных ад бездзежскіх майстрых. Фартушок займае вельмі важнае месца ў жаночым народным касцюме. Прыгожыя фартушкі з кужэльнага палатна аздоблены вышыўкай і далікатнымі карункамі, ні адзін з іх не падобны на іншы. Наведвальнікам музея прапануюць анімацыйныя і канцэртныя праграмы, дэгустацыі народных страваў і напояў. Часам тут адбываюцца выстаўкі-продажы рушнікоў, абрусаў, кашуль і фартушкоў, сатканых і вышытых ў Бездзежы. Музей "Бездзежскі фартушок" уключаны ў экскурсійныя маршруты "Россып талентаў палескіх", "Узоры і песні Палесся".

Кожнае палескае мястэчка калісьці мела сваю спецыялізацыю. Гарадная, што зараз з'яўляецца вёскай у Столінскім раёне, з далёкіх часоў была вядома дзякуючы ганчарству. Першыя згадкі пра Гарадную датаваны 1448 г., у 1579 г. атрымала магдэбурскае права і герб з выявай лася [5, с. 609]. Значную частку насельніцтва Гараднoй у свой час складалі габрэі. Габрэйскі малітоўны дом не захаваўся, на цэнтральнай плошчы стаіць Свята-Троіцкая царква, якая была збудавана ў 18 ст. у традыцыях палескага драўлянага дойлідства [6, с. 55].

Росквіту ганчарства ў Гараднoй спрыяла радовішча якаснай гліны розных гатункаў. У XIX ст. у Гараднoй было 40 ганчарных горнаў. Найбольш распаўсюджанымі тут былі гаршчковыя вырабы, якія адрозніваліся адзін ад аднаго сваімі памерамі і прызначэннем. Майстры давалі ім вельмі трапныя назвы. Вялікі гаршчок, які называўся "паляк", змяшчаў больш за пуд зярна, гаршчок "адынец" – прыблізна паўпуда, далей па памерах стаялі "пададынец", "нырознак", "злывач", "сымерык". Далікатныя невялікія гаршчкі мелі назву "мамзіль" і "мамзэлік". Тут рабілі "бунькі" , "слоі" , "слонкі", "гладышкі", "макітры", "вазонніцы".

Вялікі ўрон гараднянскаму ганчарству быў нанесены ў савецкі час, калі мясцовыя ўлады пачалі барацьбу з ганчарным промыслам, каб забяспечыць кадрамі мясцовы калгас. Неаднойчы ў Гараднoй праходзілі міліцэйскія рэйды, падчас якіх разбураліся ганчарныя печы, канфіскоўваліся вырабы. Зараз сітуацыя змянілася, але ўжо няма многіх старых майстроў. Для захавання традыцыі ў Гараднoй арганізавалі Цэнтр ганчарства, а ў 2000-я гг. тут пачалі праводзіць міжнародныя пленэры ганчароў, мэтай якіх з'яўляецца адраджэнне традыцыйнага палескага ганчарства. Падчас наведвання Цэнтра можна не толькі пазнаёміцца з вырабамі гараднянскіх майстроў і мастацкімі творамі ўдзельнікаў гараднянскіх пленэраў, а таксама пазнаёміцца з працай ганчара, нават сесці за ганчарнае кола і паспрабаваць самастойна зрабіць які-небудзь гліняны выраб. Былое мястэчка Гарадная ўключана ў экскурсіі "Па старажытнай Тураўскай зямлі", "Палеская даўніна" і "Гліняны цуд Гараднoй", але ўстойлівага турпатока тут пакуль няма.

Ганчарствам да сярэдзіны XX ст. займаліся і жыхары Пагоста-Загародскага, які знаходзіцца на беразе прыгожага возера Пагост. Пасяленне ўпершыню ўзгадваецца ў 1528 г. [7, с. 602]. У XVIII ст. тутэйшымі гаспадарамі сталі Друцкія-Любецкія. Доўгі час у Пагосце знаходзілася іх галоўная палеская рэзідэнцыя. Пагост-Загародскі ніколі не меў магдэбурскага права, але яго гаспадары, зацікаўленыя ў развіцці рамяства і гандлю, у свой час спрыялі перасяленню сюды габрэйскага насельніцтва. Габрэі жылі кампактна вакол гандлёвай плошчы, а таксама на некаторых вуліцах – Дворскай, Езёрнай, Мяшчанскай, Ганчарскай. У цэнтры Пагоста знаходзіцца будынак былой сінагогі. Тут да пачатку 2000-х гг.. захоўваўся і апусцелы будынак габрэйскай школы “Талмуд-Торы” [7, с. 521-522]. У былым касцёле Святога Юзэфа зараз дзейнічае праваслаўная царква Святых Кірылы і Мяфодзія.

Спецыялізацыя мястэчка мела некалькі накірункаў. Палешукі займаліся ганчарствам і ткацтвам, рабілі на продаж добрыя калёсы. Габрэі – шаўцы, краўцы, слесары, бляхары абслугоўвалі не толькі Пагост, але і насельніцтва ўсіх навакольных вёсак. Тыя, хто меў добрыя экіпажы, вазілі пасажыраў са станцыі Парахонск, а таксама дастаўлялі розныя тавары. Частка габрэйскага насельніцтва займалася гандлем, мела ўласныя крамы і лаўкі. Найбольш заможныя габрэі трымалі тартак, смалакурню і арандавалі ў Друцкіх-Любецкіх возера Пагост, дзе нарыхтоўвалі шмат рыбы на продаж.

Вядома шмат цікавых фактаў з жыцця мястэчка Пагост, дзе да габрэйскай культуры і быта часам дамешваліся мясцовыя асаблівасці. Важнай падзеяй у жыцці Пагоста быў візіт “столінскага рэбэ” – хасідскага цадзіка з каралін-столінскай дынастыі, які раз на год аб’язджаў добрую частку Палесся, каб падтрымаць габрэйскія абшчыны і даць свае мудрыя парады ўсім жадаючым. “Столінскага рэбэ” сустракалі з цягніка шыкоўным фаэтонам і везлі ў Пагост. Перад сінагогай фаэтон спыняўся. Мясцовыя габрэі высцілалі дарогу да сінагогі, па якой ішоў “столінскі рэбэ”, балотным аерам, як мясцовыя хрысціяне – свае хаты на Троіцу. Да таго ж, дарослыя і дзеці трымалі ў руках падобныя да веераў сцяблiны аера і, быццам пальмавамі лістамі, віталі імі паважанага госця.

Цікавы факт, звязаны з Пагостам, доўгі час не знаходзіў тлумачэння. Пры перапахаванні старых габрэйскіх могілак знойдзена шмат невялікіх керамічных кавалачкаў. Потым высветлілася, што ў габрэяў Пагоста існавала традыцыя накрываць вочы нябожчыка кавалачкамі, адбітымі ад гліняных талерак.

Мясцовае насельніцтва прытрымлівалася талерантнасці: паміж дарослымі прадстаўнікамі розных канфесій былі добрыя адносіны, а дзеці разам хадзілі ў школу і сябравалі. На Пейсах (Пасху) габрэйскія жанчыны частавалі сваіх суседзяў-хрысціян мацой. Габрэйскія хлопчыкі хадзілі разам са сваімі сябрамі – дзецьмі каталікоў і праваслаўных калядаваць – але ніколі не каштавалі забароненыя ў габрэйскай традыцыі некашэрныя стравы, якімі частавалі калядоўшчыкаў.

У габрэяў Пагоста ўласнай зямлі не было, але тут быў знойдзен цудоўны кампраміс: мясцовыя палешукі аддавалі габрэям зямлю на год ці болей не за арэндную плату, а за ўгнаенне глебы. Гэта было ўзаемавыгадна, і традыцыя

існавала да самай фашысцкай акупацыі, падчас якой загінула амаль усё габрэйскае насельніцтва Пагоста. Зараз у Пагост-Загародскі вядзе турыстычны маршрут “Па габрэйскіх мясцінах Палесся”, аб’ектамі якога з’яўляюцца былыя габрэйскія дамкі і крамы, будынак сінагогі, а таксама помнікі на месцах масавых расстрэлаў габрэйскага насельніцтва.

Калісьці на Палессі было шырока вядома мястэчка Каралін (Карлін), якое было заснавана магнатам Янам Каролем Дольскім ў 1690 г. на ўсход ад Пінска побач з уласным замкам. Пінск і Каралін раздзяляў толькі гарадскі роў, на месцы якога зараз праходзіць вуліца Равецкая. Каралінскі замак, які перайшоў да гетмана М.С. Вішнявецкага, быў у 1706 г. зруйнаваны шведамі [8, с. 82]. Ад мінуўшчыны ў Караліне захаваліся касцёл Караля Барамеуша, які належаў барталамітам ці “манахам-камуністам”, запрошаным Я.К. Дольскім з далёкай Італіі, і былы касцёл бернардынцаў, які пасля 1830 г. быў пераасвечаны ў праваслаўную царкву. Ян Караль Дольскі ў свой час запрасіў перасяляцца ў Каралін заможныя габрэйскія сем’і з Пінска. Адна за другой тут паўставалі сінагогі і малітоўныя дамы, найбольш заможныя і паважаныя габрэі забудавалі прыгожымі камяніцамі былую вуліцу Каралінскую (зараз – гэта вуліца Савецкая).

У другой палове XVIII ст. у Караліне, ці ў Карліне, як называлі мястэчка габрэі, жыў рабін Аарон Пярлоў, празваны Ааронам Вялікім альбо Карлінерам. Ён сабраў вакол сябе вучняў і пачаў прапаведаваць хасідызм – новую рэлігійную плынь, якая зарадзілася ў Заходняй Украіне [9, с. 103]. Ідэі хасідызма, дзе вышэйшымі каштоўнасцямі лічыліся набожнасць, дабрачыннасць і аптымізм, хутка захапілі шырокія масы габрэйскага насельніцтва Палесся і пашырыліся на ўсю Літву. У іншых кутках ВКЛ, нават у сталіцы Вільні, хасідаў звычайна называлі “карлінэрамі”. А вось у самім мястэчку Каралін гэта назва не прыжылася. Хрысціянскае насельніцтва называла хасідаў “скакунамі” праз звычку танчыць (скакаць) у час малітваў. Яшчэ адна мясцовая назва хасідаў была “кітаеўцы”, бо хасіды-мужчыны апраналіся ў лапсардакі (верхняе мужчынскае адзенне), пашытыя з чорнага ці цёмна-сіняга атласа, які прывозілі з Кітая. Карлінскія хасіды з доўгімі пейсамі і барадамі ў сваіх атласных лапсардаках, кароткіх, крыху за калена чорных нагавіцах і гэткіх жа панчохах, з кіпамі (ярмолкамі) альбо вялізнымі чорнымі капялюшамі на галаве, паласатымі талесамі на плячах надавалі мястэчку Каралін асаблівы непаўторны каларыт. Мясцовыя жыхары, здатныя да пляцення з лазы, рабілі невялікія скрыначкі, куды было зручна прыбіраць скураныя футлярчыкі “тфіліны”, якімі іудэі карыстаюцца ў час малітваў.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Каралін быў далучаны да Пінска, але іх габрэйскія абшчыны не аб’ядналіся і працягвалі канкурыраваць паміж сабой. У XIX ст. у Караліне вакол мясцовага габрэя Шауля Рабіновіча ўтварылася так званая “саляная мафія”, якая, дзякуючы сувязям і сваім энергічным дзеянням, трымала ў руках саляны гандаль уздоўж воднага шляху, што звязваў Крулявец (зараз Калінінград) з Палессем, гарадамі і вёскамі па берагах Дняпра да самага Екацярынаслава.

У свой час у Караліне жылі ці наведвалі яго вядомыя людзі. Некаторы час тут пражыла сям’я першага прэзідэнта Ізраіля Хаіма Вейцмана. Маленькай

дзяўчынкай гуляла па каралінскіх вуліцах будучы прэм’ер-міністр Ізраіля Голда Меір, якая ў дзяцінстве жыла ў Пінску на радзіме сваей маці Блюмы Найдзіч. На каралінскіх могілках былі пахаваныя пачынальнікі хасідызму – святыя цадзікі Аарон Карлінскі і ягоны сын Ошэр Столінскі, а таксама бацька Хаіма Вейцмана [9, с. 104].

З 1 мая па 29 кастрычніка 1942 г. частка Караліна разам са старымі габрэйскімі могілкамі ўваходзіла ў склад гета, вязні якога знішчаны восенню 1942 г. У сярэдзіне і другой палове XX ст. зніклі шматлікія сінагогі і малітоўныя дамы, якія знаходзіліся ў былым мястэчку (напярэдадні Другой сусветнай вайны іх агульная колькасць у Пінску і Караліне дасягала 42). Былі разбураны ці перабудаваны каменныя і драўляныя дамы, у якіх жылі каралінскія габрэі. Не засталося знаку ад знакамітых каралінскіх корчмаў.

У 1990-я гады ўзнікла прапанова зрабіць у Караліне этнаграфічны аб’ект “Карчма”, які адначасова з’яўляўся б габрэйскім музеем, габрэйскім тэатрам і рэстаранам традыцыйнай габрэйскай кухні. Але справа зацягнулася, і гэтая цікавая ініцыатыва не была рэалізаванай.

Былы Каралін – гэта адно з нешматлікіх на Беларусі месцаў, дзе можна пазнаёміцца з габрэйскімі традыцыямі, пабачыць іншаземных гасцей у каларытным традыцыйным убранні, якія спяшаюцца ў сінагогу, вучняў адзінай у Беларусі габрэйскай школы-інтэрната. У Караліне па сённяшні дзень адбываюцца традыцыйныя габрэйскія вяселлі. Тут можна было назіраць такую цікавую з’яву, як нясенне Торы з адной сінагогі ў другую. Гэта было вельмі незвычайнае відовішча. Купленую за мяжой Тору спачатку, згодна з традыцыяй, дапісвалі гусіным пяром у канфедэрацкай сінагозе рабіны і нанятыя перапісчыкі, якія з’ехаліся на гэтую падзею з розных краін. Потым пад хасідскія спевы і танцы пры святле паходняў, якія трымала моладзь, Тору ганарова пранеслі пад шыкоўным балдахінам у суседнюю сінагогу, якая месціцца ў былым малітоўным доме рабінаў Пярловых.

Былы Каралін, які зараз з’ўляецца часткай Пінска, уваходзіць у маршрут агляднай экскурсіі “Пінск – горад дзевяці стагоддзяў”, яму прысвечана асобная экскурсія “Па гістарычнаму прадмесцю Каралін”. Вялікім попытам у габрэйскіх групах, асабліва паломніцкіх, карыстаецца экскурсія “Па слядах палескіх хасідаў”.

Тэму хасідызму працягвае былое мястэчка Столін, куды ў свой час пераехаў з Карліна сын Аарона Вялікага рабін Ошэр Столінскі (Сталінэр). Побач з гандлёвай плошчай, на якую вядзе брукаваная шасціграннай “трылінкай” дарога, у Століне знаходзіцца дом рабіна і велічная руіна сінагогі, пабудаваная ў 1792 г. у стылі барока. Тут жылі і ўзносілі свае малітвы да Бога прадстаўнікі знакамітай каралінастолінскай дынастыі. Апошні “столінскі рэбэ” быў расстраляны разам са сваёй сям’ёй і іншымі вязнямі столінскага гета восенню 1942 г. у Стасінскім лесе побач са Столінам [5, с. 308]. Зараз тут, на краю вялізнай ямы-магілы, якую з усіх бакоў атачаюць старыя сосны, узвышаецца помнік з чорнага граніту ў выглядзе вялікай кнігі.

Тэма Халакоста з’яўляецца адной з галоўных пры наведванні палескіх мястэчак, размешчаных уздоўж Прыпяці і Гарыні. Кажан-Гарадок (былая назва Гарадзец)

узгадваецца ў 1493 г., але гісторыкі лічаць, што населены пункт узнік у далёкай старажытнасці [10, с. 90]. Паблізу мястэчка знаходзяцца дагістарычныя валы. Сярод шматлікіх могілкавых курганоў калісьці вылучалася Відзіўш-Гара, размешчаная ў вусці ракі Цны, якую лічылі магілай сасланага рымскага паэта Авідыя. Кажан-Гарадок належаў Мантыгірдывічам, Кішкам і Шчытам. Яўрэі з'явіліся ў Кажан-Гарадку ў XVI ст., што пацвярджалі старыя помнікі, могілкі і будынак халоднай сінагогі.

Кажан-гарадоцкія габрэі спрычыніліся да таго, каб суседні Лунінец ператварыўся з вёскі на мястэчка. Падчас будаўніцтва Палескіх чыгунак, калі Лунінец стаў вузлавой станцыяй, габрэі па-ранейшаму не мелі дазволу масава перасяляцца ў гэты населены пункт з-за яго вясковага статусу. Каб вырашыць праблему, кажан-гарадоцкія габрэі пайшлі на хітрасць. Добра пачаставаўшы гарэлкай мясцовых мужыкоў, яны сабралі подпісы ад жыхароў Лунінца пад прашэннем аб наданні яму статуса мястэчка. Як толькі губернатар зацвердзіў местачковыя правы, кажан-гарадоцкія габрэі пачалі перасяляцца ў Лунінец. Мясцовыя сяляне, апамятаўшыся, спрабавалі адмяніць рашэнне, але беспаспяхова. Доўгі час у Лунінцы не было ўласных габрэйскіх могілак, і нябожчыкаў габрэяў, як і раней, хавалі ў Кажан-Гарадку.

Зараз пра габрэйскае насельніцтва Кажан-Гарадка нагадвае мемарыяльны комплекс з чорнага граніту і цагляныя дамкі ў цэнтры Кажан-Гарадка. Непаўторны воблік Кажан-Гарадку надае драўляная Свята-Мікалаеўская царква, якая была пабудавана побач з гандлёвай плошчай у 1818 г. па фундацыі Крыштафа Шчыта. Царква будавалася як уніяцкая, а пасля скасавання Уніі была пераасвечана ў праваслаўную. Крыштаф Шчыт нават аспрэчваў гэтую перадачу, а жыхары Кажан-Гарадка працягвалі трымацца Уніі і не хацелі прызнаваць праваслаўнага святара. Па сёняшні дзень захаваліся прыгожае драўлянае аздабленне царквы, зробленае мясцовымі майстрамі, і старажытныя "некананічныя" абразы. Царква стаіць на высокім штучным пагорку і ўяўляе сабой цудоўны помнік беларускага драўлянага барока [6, с. 93]. На жаль, не захаваўся былы маёнтак Шчытоў, дзе ў свой час жыў знакаміты сваімі дзівацтвамі Крыштаф Шчыт.

Недалека ад Кажан-Гарадка на рацэ Смердзь знаходіцца былое мястэчка Лахва, якое калісьці належала Мантыгырдывічам і Радзівілам [8, с. 87-88]. У мінулым Лахва была знакамітай дзякуючы "лахвенскаму перавозу". Рака Смердзь перад упадзеннем у Прыпяць падзяляецца на рукавы, і Лахва вельмі нагадвала палескую Венецыю. Пра гэта ў свой час пісаў У. Караткевіч у кнізе "Зямля пад белымі крыламі". Нават зараз у былым мястэчку можна натрапіць на каналы с цёмназялёнай вадой, схаваныя ў глыбіні за старымі дрэвамі і зараснікамі вербалозу, па якіх улетку рухаюцца чаўны мясцовых жыхароў. Знакаміты старажытны шлях, які ішоў праз Лахву, злучаў калісьці Вільню, Наваградак, Нясвіж з межамі Асманскай імперыі. У свой час гэтым шляхам праехала знакамітая Саламея Русецкая, якая выкупляла з турэцкага палону жаўнераў і афіцэраў і за адпаведную плату вяртала іх родным і блізкім, аб чым яна ўспаміната ў мемуарным творы "Авантуры майго жыцця".

Лахвенскі перавоз праз Прыпяць даваў працу і заробак шмат каму з мясцовых жыхароў. Габрэі Лахвы займаліся перавозам пасажыраў і тавараў, былі рамізнікамі-балаголамі. У цэнтры мястэчка было шмат крамаў і лавак, тут былі рэстарацыі і невялічкія гатэлі. Зараз пра габрэяў Лахвы нагадваюць старыя габрэйскія могілкі, помнік у гонар паўстання ў Лахвенскім гета, брацкая магіла ахвяр Халакосту. На месцы касцёла, фундаванага Радзівіламі, стаіць цагляная Спаса-Праабражэнская царква ў рэтраспектыўным-рускім стылі. Захаваліся і рыбныя сажалкі, якімі ў свой час валодалі Радзівілы. Найчасцей Лахву наведваюць удзельнікі тура "Габрэі на Палессі". Лахва ўключана і ў новы турыстычны маршрут "Лунінецкая мазаіка".

Габрэйскі след прасочваецца ў шмат якіх палескіх мястэчках, але толькі ў былым мястэчку Ленін можна пабачыць унікальныя драўляныя мацэвы на старых габрэйскіх могілках. Гэткай з'явы больш няма нідзе: ні ў Беларусі, ні за яе межамі. Дрэва – матэрыял недаўгавечны, многія мацэвы нахіліліся ці паваліліся на магілы, некаторыя з іх сабраны і пастаўлены пад навес побач з агароджай.

У 1941 г. шмат габрэяў з Леніна знаходзілася ў рабочым лагеры ў Ганцавічах. Пасля ўцёкаў з лагера габрэі далучыліся да партызанскага руху. Ля вёскі Багданаўкі на Лунінеччыне быў арганізаваны партызанскі атрад імя Кагановіча, аснову якога складалі габрэі з Леніна і Пагоста. Пры мясцовай школе зараз дзейнічае краязнаўчы музей, які распавядае гісторыю былога мястэчка. Дарэчы, не спыняюцца спрэчкі наконт паходжання назвы "Ленін". Галоўнае, што вядомы правадыр пралетарыяту У.І. Ленін да гэтай назвы не мае ніякага дачынення. Яна ўтварылася яшчэ ў старажытнасці, магчыма, ад жаногага імя Алена альбо ад паняцця "леннае ўладанне". За польскім часам гэта назва пачала раздражняць мясцовыя ўлады. Жыхары навакольных вёсак па розных патрэбах ішлі і ехалі "да Леніна". На некаторы час мястэчка было перайменавана ў Саснковічы ў гонар польскага генерала Казіміра Саснкоўскага [1, с. 507].

Давыд-Гарадок на рацэ Гарынь у 2000 г. адзначаў свае 900-годдзе. У гонар гэтай падзеі ў цэнтры, на былой гандлёвай плошчы, быў пастаўлены помнік заснавальніку горада князю Давыду Ігаравічу [11, с. 125-127]. Гісторыя Давыд-Гарадка месціць шмат падзей і гістарычных асобаў, аб чым памятае старажытная Замкавая гара над старым рэчышчам Гарыні. У XX ст. Давыд-Гарадок уступіў сваю адміністрацыйную ролю Століну і адсунуўся на перыферыю, што дазволіла яму ўратаваць непаўторнае аблічча старога палескага мястэчка. Асаблівы каларыт Давыд-Гарадку надаюць тры вялікія масты праз Гарынь і возера Сежка. Ад былога рынка разыходзяцца, быццам промні, старыя вуліцы, брукаваныя "косткай", уздоўж якіх стаяць каменныя будынкі былых габрэйскіх крамаў і майстэрняў і прыгожыя, найчасцей драўляныя, дамкі з сонейкамі на франтонах і бляшанымі аздабленнямі на комінах і вадасцёках. Захаваліся драўляная Юр'еўская царква (1724 – 1726) і цагляная царква іконы Казанскай Божай Маці (1890), касцёл перабудаваны, а так званая "Залатая" сінагога знікла ўвогуле.

Ужо ў XVI ст. да карэннага насельніцтва Давыд-Гарадка далучыліся татары, якія трапілі ў палон і атрымалі дазвол асесці ў Давыд-Гарадку. Па сёняшні дзень частка жыхароў Давыд-Гарадка мае характэрнае аблічча: круглыя твары і

раскосыя вочы. Да сярэдзіны XX ст. у Давыд-Гарадку захоўваўся традыцыйны народны строй, адметнай рысай якога быў жаночы галаўны ўбор “галовачка” (“галава”), падобны на турбан. Часта ён дапаўняўся ўзорыстай хусткай – тараноўкай, якая прапускалася пад падбародкам і завязвалася на цемі, што яшчэ болей нагадвала пра традыцыі мусульманскага ўсхода [5, с. 537].

На працягу некалькіх стагоддзяў тут жыло шмат габрэяў, з якіх уцалелі адзінкі, з’ехаўшыя перад Другой сусветнай вайной у Палестыну ці Амерыку. Давыд-Гарадок быў цесна звязаны з Лахвай дзякуючы Лахвенскаму перавозу. Не дзіва, што тут было шмат рамізнікаў-балаголаў. Татары займаліся гарбарствам, а больш за ўсё – агародніцтвам. Апошні занятак стаў спецыялізацыяй Давыд-Гарадка і суседніх Альшанаў у XX ст. У савецкі час амаль кожная сям’я займалася вырошчваннем гародніны і кветак на насенне, якое вазілі на продаж. Адметная рыса Давыд-Гарадка – садкі, цяпліцы і прыгожыя кветнікі.

У канцы XIX ст. у Давыд-Гарадку было 1177 двароў, 7385 жыхароў, 2 царквы, народнае вучылішча, 3 яўрэйскія школы, аптэка, аптэчны магазін, 51 лаўка, працавалі 27 кавалёў, 25 краўцоў, 38 шаўцоў, 30 плотнікаў і майстроў-лодачнікаў. У мястэчку адбываўся штотыднёвы кірмаш па нядзелях. Некаторы час дзейнічалі бровар і карабельная верф.

За польскім часам у мясцовых жыхароў была свая спецыялізацыя. Тут выраблялі знакамітыя давыд-гарадоцкія “лёды” (марозіва). Калі да прыстані насупраць Замкавай гары падыходзіў пасажырскі параход “Пяст” з Пінска, насустрач пасажырам заўсёды рухаліся прадаўцы “лёдаў” са сваім смачным таварам. Давыд-Гарадоцкія “лёды” былі вядомыя і ў гарадах Польшчы. Другі знакаміты давыд-гарадокскі выраб – гэта непрамакаемыя высокія бясшоўныя боты для паляўнічых, якія вельмі цаніліся сярод арыстакратаў – аматараў палявання ў Польшчы, Германіі, Францыі і Англіі. Для ўдзельнікаў настальгічных тураў, кроўна звязаных з Давыд-Гарадкам, гэтая гісторыя, як і паказ старой забудовы – вельмі хвалюючы момант, кульмінацыя экскурсійнай праграмы, за якую яны вельмі ўдзячны стваральнікам тура і экскурсаводам.

У пасляваенны час Давыд-Гарадок змяніўся, хаця і ў меншай ступені, чым некаторыя іншыя мястэчкі. Знікла габрэйскае насельніцтва, але аднекуль сюды прыйшлі і аселі цыганы, якія зноў-такі надаюць былому мястэчку непаўторны каларыт. На гэта ў свой час звярнуў увагу У. Караткевіч. Мясцовыя цыганы – нашчадкі колішіх выгнаннікаў з Індыі – натхнілі пісьменніка на стварэнне аповесці “Краіна Цыганія”. Развіццё этнічнай тэмы ў Давыд-Гарадку можа ісці як у бок рэканструкцыі сцэн даваеннага жыцця XX ст. з дэгустацыяй “лёдаў”, катаннем на лодках і г.д., так і па шляху стварэння анімацыі на цыганскую тэму.

Былое мястэчка Целяханы таксама было шматнацыянальным: тут жылі беларусы, татары, габрэі, палякі. Свайго росквіту яно дасягнула ў часы гетмана М.К. Агінскага, які меў тут сваю рэзідэнцыю з тэатрам, а таксама фаянсавую мануфактуру і шклозавод. Намаганнямі гетмана быў пракладзены знакаміты Агінскі канал, які злучыў Ясельду і Шчару і даў занятак, трывалы заробак мясцовым жыхарам, якія абслугоўвалі гэты канал, а таксама сплаўлялі па ім лес да самага Балтый-

скага мора [8, с. 138]. У канцы XIX ст. Ф.І. Пуслоўскі заснаваў тут новы шклозавод, дзе прымяняліся найноўшыя дасягненні навукі і тэхнікі ў гутнай справе таго часу. У першай палове XX ст. тутэйшы шклозавод стаў буйнейшым на Беларусі, яго прадукцыя, асабліва лямпы "венскія", "берлінскія", а таксама сервізы з крышталю і каляровага шкла, такія як "Алівер стары фасон" карысталіся шырокім попытам у Расіі, Польшчы і многіх краінах Заходняй Еўропы. На жаль, разбураны і разрабаваны завод не аднавіў сваёй дзейнасці, страціў сваю ролю і славуты Агінскі канал. Мястэчка Целяханы згубіла сваю адметнасць, і ягоная інтэграцыя ў турыстычныя маршруты зараз звязана з транзітным патокам турыстаў, які рухаецца ў бок Выганашчанскага возера.

Паміж Целяханамі і Пінскам знаходзіцца былое мястэчка Лагішын, якое ў свой час за заслугі перад дзяржавай, перш за ўсё за будаўніцтва Агінскага канала, было падаравана гетману М.К. Агінскаму. Першыя згадкі пра Лагішын (Лагічын) зроблены ў 1552 г. [11, с. 76-77]. Ён быў уласнасцю Радзівілаў, якія збудавалі тут касцёл. У 1643 г. Лагішын атрымаў магдэбургскае права з выявай ваўка, які мае ласіныя ногі і хвост ліса. Знакамітым Лагішын зрабіў цудоўны абраз Маткі Боскай Лагішынскай, які трапіў сюды невядома адкуль у абозе афіцэра, што ваяваў на баку шведаў. Калі была скасавана унія, лагішынскія уніяты не прынялі праваслаўе і пайшлі за касцёлам, таму па сённяшні дзень Лагішын з'яўляецца каталіцкам асяродкам сярод былых мястэчак і вёсак Палесся. На былой гандлёвай плошчы побач стаяць праваслаўная царква і касцёл – санктуарыум Маткі Боскай Лагішынскай, каранаванай папскімі каронамі.

На старых могілках можна пабачыць магілы прадстаўнікоў палескай шляхты. У памяць аб габрэях Лагішына захаваліся старыя цагляныя будынкі на галоўных вуліцах і старыя габрэйскія могілкі. А ў апошні час склалася традыцыя, калі не толькі каталіцкія паломнікі, але экскурсійныя групы з розных куткоў Беларусі на шляху ў Пінск ці Моталь наведваюць Лагішын, каб дакрануцца да цікавай гісторыі мястэчка і пабачыць цудатворны абраз Маткі Боскай.

Такім чынам, нельга не адзначыць, што палескія мястэчкі яшчэ не згубілі сваёй адметнасці, яны цікавяць як замежных, так і беларускіх турыстаў. Сам сабой напрошваецца турыстычны маршрут па палескіх мястэчках. Каб зацікавіць гэтай тэмай, трэба весці адпаведную рэкламную работу, якая ўключае стварэнне відэаролікаў, напісанне турыстычных даведнікаў і правядзенне рэкламных тураў для зацікаўленых у фармаванні новага турпрадукта беларускіх і замежных тураператараў.

*Літаратура*

1. Rąkowski G. Czar Polesia, Rewasz, Pruszków, 2001. – 600 s.

2. Вёска над Ясельдай: Гіст.-краязн. нарыс. – Мн.: Полымя, 1991. – 101 с.: іл.

3. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2000. – 592 с.: іл.

4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Драгічынскага раёна / Беларускае тэлеграфнае агенцтва; Я.Я. Аляксейчык і інш.; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БЕЛТА, 1997. – 575 с.

5. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Столінскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – 640 с.: іл.

6. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін; Маст. І. І. Бокі. – Мн.: БелЭн, 2001. – 328 с.: іл.

7 Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – 624 с.: іл.

8. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu. — Brześć: Oddział ⁄ Polskiego Towarzystwa Krajoznawczego w Brześciu nad Bugiem, 1935. — 160 s.

9. Хвагіна, Т.А. Пінск і яго ваколіцы [Текст] = Пинск и его окрестности = Pinsk and its surroundings : научно-популярная литература / Т. А. Хвагіна. - Минск : Вышэйшая школа, 2010. - 176 с.

10. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Лунінецкага раёна / Укл. Т. В. Канапацкая. Мн.: Беларусь, 1995.– 716 с.: іл.

11. Хвагіна, Т.А. Палессе ад Буга да Убарці [Текст] = Полесье от Буга до Уборти = Polesye from the Bug to the Ubort : навукова-папулярнае выданне / Т.А. Хвагіна; ред. Г.У. Новікава. - Мінск : Вышэйшая школа, 2005. - 143 с. : іл.

The work characterizes the main trends, objects and forms to realize ethnic tourism in Belarus, the creation of trips and tours on the basic of ethnographic and historic heritage being one of these trends. Cultural and historic phenomenon of Polessey boroughs is considered in terms of modeling tourist products and their integration in tourist itineraries.

**Хвагіна Тацяна Аркадзеўна, загадчык даследчай лабараторыі рэгіянальнага турызму УА “Палесскі дзяржаўны універсітэт”.**